мозе агню ўсіх відаў зброі пры падтрымцы артылерыі, супрацьпаветранай абароны, удараў авіяцыі яны адбілі атаку ворага, нанёсшы паражэнне як у бранятэхніцы, так і ў жывой сіле. Мотастралкі і артылерысты паказалі зладжаныя дзеянні і ўмелыя навыкі абарончага бою.

Вайскоўцы актыўна выкарыстоўвалі авіяцыю і беспілотныя лятальныя апараты. Ваенныя інжынеры прарабілі праходы ў мінных палях. Акрамя таго, была паспяхова фарсіравана водная перашкода. Прычым пераважная частка задач была выканана ў начны час.

Алег Белаконеў падкрэсліў:

— Створана дынамічная абстаноўка, якая прымушае камандзіраў, камандуючых прымаць неардынарныя рашэнні ў самыя кароткія тэрміны. Мы сыходзім ад азбукі і пераходзім да дзеянняў, якія дазваляюць выконваць пастаўленыя задачы з найбольш высокай якасцю. Нягледзячы на тое што ідзе моцнае радыёэлектроннае прыгнятанне, сістэма кіравання паказвае досыць высокую ступень устойлівасці.

Падводзячы вынікі вучэнняў, **міністр абароны Беларусі Андрэй РАЎКОЎ** зазначыў, што задачы, якія ставіліся на вучэнні, дасягнуты. Сістэма падрыхтоўкі нашых Узброеных Сіл і Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі, якая закладзена ў планы баявой падрыхтоўкі па прызначэнні, дазваляе нам планамерна забяспечваць пастаянную гатоўнасць да выканання сумесных задач у рамках абароны Саюзнай дзяржавы і нашых краін ад умоўнага праціўніка.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота атрымана ад Міністэрства абароны.**

---

выканання віражоў з улікам хуткасці, крэну, адлегласці паміж дзвюма машынамі. Візуальна ацэньвалі суддзі, якія выстаўлялі адзнакі за пілатаж. А заключным этапам у нашай намінацыі стала баявое прымяненне, якое доўжылася два дні. Яно прадугледжвала выкарыстанне некіруемых ракет і стральбу са стралкова-гарматнага ўзбраення. Дакладнага падання з дапамогай ракет дабіцца вельмі цяжка, таму суддзі вызначылі радыус заліковай плошчы ў трыццаць метраў. Але мы адзіныя, дзе і вядучы, і вядзёны экіпаж у абодвух палётах дабіліся прамога падання з гарматы. Баявое прымяненне, адпаведна, і выцягнула нас на першае месца.

Перш чым адправіцца ў Расію, ваенныя лётчыкі тры тыдні трэніраваліся на палігоне блізу Ружан — там была арганізавана абстаноўка, ідэнтычная той, якая была створана на самых Гульнях. Непасрэдна ж у Дубровічы яны прыляцелі за два тыдні да пачатку першых заліковых стартаў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**

# Як вучыліся партызанскія дзеці?

Дзеці народных мсціўцаў падчас Вялікай Айчыннай наведвалі навучальныя заняткі ў многіх сямейных партызанскіх лагерах. Як успамінаў выдатны арганізатар партызанскага руху ў Беларусі Кірыл Трафімавіч Мазураў у кнізе «Незабыўнае», «...нягледзячы на цяжкасці, стварэнне школ у лясах ішло поўным ходам. Першымі падхапілі заклік аб арганізацыі навучання дзяцей у партызанскіх зонах (у вёсках і лясных лагерах) камсамольцы Палескай вобласці. Пачын пазней распаўсюдзіўся ў Мінскай, Пінскай і іншых абласцях. Стварэнне ў тыле ворага савецкіх школ служыла не толькі аб'яднанню і выхаванню дзяцей, але і ўсяляла веру людзей у непазбежнае выгнанне гітлераўцаў». Вядомы паэт-франтавік Анатоль Вялюгін у вершы «Партызанская школа» праўдзіва апісаў тыя падзеі:

*Сухім пергаментам —*
*бяросты скрутак.*
*Мурашкі-літары...*
*На сэрцы смутак:*
*Пісаць вучылася*
*палеская дзятва,*
*Як вылі «юнкерсы»*
*па сорак сутак,*
*Гарэлі воблакі, і дрэвы, і трава.*

Толькі ў Брэсцкай вобласці на 1 мая 1944 года такім чынам навучалася 490 дзяцей. Усе лясныя школы былі пачатковыя, толькі з першымі чатырма класамі навучання. Яны, як правіла, размяшчаліся ў зямлянках, будынках, пабудаваных з лазы і іншых падручных матэрыялаў. У іх арганізацыі бралі ўдзел партызанскі актыў, настаўнікі, бацькі, самі дзеці. Будавалі лясныя школы ў неверагодна цяжкіх умовах: не было падручнікаў, сшыткаў, пісчай паперы, наглядных дапаможнікаў, нармальных прыстасаваных памяшканняў для заняткаў. У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны як адна з самых каштоўных рэліквій ваеннай пары захоўваецца ліст ад 22 лістапада 1942 года сакратара ЦК ЛКСМБ Кірыла Мазурава першаму сакратару Цэнтральнага Камітэта камсамола Беларусі Міхаілу Зімяніну пра работу лясных школ. Апісваецца, як па прычыне адсутнасці пісьмовых прылад «камсамольцы атрада Мікалая Розава хадзілі па гэтых пытаннях у розныя вёскі і сабралі 150 алоўкаў, некалькі падручнікаў, некалькі дзясяткаў сшыткаў. У Акцябрскім раёне 14.09 правялі канферэнцыю настаўнікаў, 15.09 — бацькоўскі сход. 16 верасня школы пачалі работу. Колькасць дзяцей, якія навучаюцца ў іх, — 271 чалавек. Карпілаўская школа — 47 дзяцей, Рудабельская — 10, Рудніцкая — 20, Стара-Дуброўская — 26, Нова-Дуброўская — 52».

Дапамаглі, як заўсёды, народная кемлівасць і мудрасць партызан. Так, пры вырабе пісьмовых прылад партызаны з кары дуба выразалі для першакласнікаў літары для азбукі, з галінак рабілі класныя лічыльнікі. Народныя ўмельцы знайшлі спосаб вырабу чарніла: рабілі адвар з дубовых жалудоў, кідалі туды ржавы цвік або кавалак жалеза. Гэтая сумесь адстойвалася, і атрымлівалася чарніла. Часта навучальныя дапаможнікі даставаліся з мясцовага насельніцтва, а так-



**Урок у лясной школе вядзе камандзір.**

сама праз сувязных і разведчыкаў у населеных пунктах. Класных дошак не было, замест гэтага навучэнцы пісалі выгбляванымі палачкамі на зямлі і пяску. Нярэдка для падліку выкарыстоўвалі гільзы патронаў. З-за адсутнасці падручнікаў і сшыткаў, ручак і алоўкаў дзеці пісалі на палях газет і ўпаковачнай паперы, адваротным баку нямецкіх улётак, а часам і проста палачкамі на бяросце або на пяску. Партызаны абсталявалі прыстасаваныя памяшканні для заняткаў, рабілі парты. З-за адсутнасці падручнікаў і праграм педагогі-партызаны навучалі дзяцей па палітычнай літаратуры, якая была ў атрадах. Часта настаўнікі выкарыстоўвалі ў рабоце з дзецьмі загады Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, тэксты з газет, брашур або ўлётак-зводак Саўінфармбюро.

У некаторых брыгадах нават ісnavалі піянерскія арганізацыі. З успамінаў былой вучаніцы школы № 2 пры партызанскім атрадзе імя М. І. Калініна Т. К. Кот, якая пасля вайны стала працаваць настаўніцай у школах Брэсцкай вобласці: «Камандаванне атрада дазволіла нам пашыць з парашутнага палатна піянерскую форму. Мы зрабілі сабе таксама піянерскія гальштукі. Асабліва старанна і ўважліва вышывалі ўсім калектывам піянерскі сцяг. Неўзабаве ва ўрачыстай абстаноўцы былі прыняты ў піянеры яшчэ 28 дзяцей. Пасля гэтага выбралі штаб піянерскай дружыны». У музеі захоўваюцца сцянныя газеты «Наша вучоба» і «Піянер» піянерскіх арганізацый партызанскіх брыгад Брэсцкай вобласці. У іх — жыццё юных піянераў, вучоба і грамадская работа. Акрамя навучання дзяцей пісьму, чытанню і арыфметыцы, настаўнікі праводзілі з імі вялікую выхаваўчую работу, прывівалі ім працоўныя навыкі. У вольны час маскіравалі лагеры, займаліся добраўпарадкаваннем, збіралі ягады, грыбы, нарыхтоўвалі дровы.

Найбольшае распаўсюджанне лясныя школы атрымалі ў Брэсцкай і Баранавіцкай абласцях. Тут пры партызанскіх атрадах і злучэннях працавала каля дваццаці партызанскіх школ. Дакладна вядома, што першая лясная школа на Брэстчыне была арганізавана восенню 1943 года пры атрадзе імя М. І. Калініна, дзе ў трох класах навучалася 50 дзяцей малодшых класаў. Пры сямейным лагеры атрада імя А. А. Жданава пачатковым навучаннем было ахоплена 38 дзяцей. Адным з атрадаў у брэсцкіх лясах камандаваў лейтэнант Яўген Георгіевіч Макарэвіч — ініцыятар стварэння лясной школы, дзе навучалася 98 дзяцей. Пасля яго гібелі ў чэрвені 1943 года атрад брыгады імя Я. М. Свярдлова быў названы імем камандзіра.

У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны захоўваецца справаздача аб выхаваўчай рабоце сярод дзяцей школьнага ўзросту 4-га сямейнага лагера гэтага атрада за чэрвень 1944 года. У справаздачы гаворыцца, што «ў сямейным лагеры школу наведваюць 46 дзяцей, з іх 1-га класа — 24, 2-га класа — 13, 3-га класа — 9 чалавек. На ўроках вывучаюцца наступныя прадметы: руская мова, арыфметыка, спевы. Дзеці вывучылі на памяць вершы «Взвилась ракета боевая», «Ведут народы бой», «Наша славная земля». У пазаўрочны час праведзены гутаркі «Аб дзеяннях партызан», «Аб дапамозе насельніцтва партызанам», «Аб гераічных дзеяннях партызанкі Тані». Па фізкультуры ў 2 і 3 класах вывучаны тэмы «Пастраенне ў шарэнгу і калону», «Павароты на месцы і ў руху», «Выхад са строю». Акрамя таго, з дзецьмі праведзены заняткі па бегу на кароткія дыстанцыі, скачках у даўжыню, падцягванні на турніку, адпрацаваны практыкаванні па гранатакіданні, вывучэнні ўстройства вінтоўкі, трэніроўкі з макетамі стралковай зброі. З гонарам арганізатар выхаваўчай работы паведамляе ў справаздачы, што ў лясной школе сістэматычна працавалі гурткі мастацкай самадзейнасці і дзіцячых работ. «Хлопцы даглядалі школьны агарод, займаліся зборам лекавых траў: за сезон сабралі кветак ландыша — 0,5 кг, лісця папараці — 6 кг, кветак рамонка — 1 кг, каранёў валяр'яны — 4 кг, ліпавых кветак — 1,5 кг».

У школьным сшытку, размешчаным у «Партызанскім лагеры» музея, падрабязна перададзена справаздача настаўніцы Паліны Ясноўскай пра вучэбна-выхаваўчую работу лясной школы атрада імя А. А. Жданава брыгады імя Я. М. Свярдлова з 12 мая да 12 ліпеня 1944 года. Атрад дзейнічаў у Драгічынскім раёне Брэсцкай вобласці. Тут навучаннем было ахоплена 58 дзяцей: 23 хлопчыкі і 35 дзяўчынак малодшага школьна-




**Насценгазета, якую выпускалі піянеры школы партызанскага атрада імя А. Жданава.**

га ўзросту. Як відаць са справаздачы, вучэбны дзень тут складаўся з чатырох урокаў па 45 хвілін кожны. Перапынкі паміж урокамі наступныя: малыя перапынкі па 10 хвілін, вялікі перапынак 30 хвілін. Заняткі праводзіліся ў школе ў дзве змены. Паспявалі навучэнцы добра. У канцы навучальнага года былі праведзены выніковыя заняткі і экзамены ў прысутнасці камандзіра партызанскага атрада, камісара, сакратара камсамольскай арганізацыі і настаўнікаў з іншага атрада. Па заканчэнні школы навучэнцам выдаваліся спецыяльныя пасведчанні. Адно такое захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Яно выдадзена па выніках 1943/44 навучальнага года Алене Данілковіч, навучэнцы 3 класа лясной школы атрада імя М. І. Калініна (у музеі захоўваецца і фота вучаніцы). Пасведчанне падпісана камісарам атрада Ф. А. Бяляевым і завучам школы настаўніцай П. В. Іваноўскай. Заняткі ў лясных школах вялі настаўнікі, якія жылі ў месцах дыслакацыі народных мсціўцаў, або запрошаныя імі з іншых населеных пунктаў, часам да работы з дзецьмі прыцягвалі былых студэнтаў, старшакласнікаў з ліку партызан.

То былі самаадданыя людзі, якія бязмежна любілі сваю справу, якіх аб'ядноўвала адно — выхаваць годную змену, сапраўдных грамадзян роднай Бацькаўшчыны.

**Мікалай ШАЎЧЭНКА.**



**Партызанская школа змадэлявана ў Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.**